№ 35 (772)
Снежань 2019 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

bfk.by

У нумары:

☞ З натуры: *беларускія куточкі на палотнах Пятра Шарыпы –* *стар. 2*

☞ Лёс: *сувоі гадоў палявода і ткачыхі Вольгі Ярмак –* *стар. 4*

☞ Асоба: *Алег Бембель – Зьніч – айцец Іаан –* *стар. 6*

Айчынныя і замежныя эксперты абмяняліся меркаваннямі і планамі

Веды і адукацыя – цягам і глыбінёю жыцця

У пачатку снежня ў Мінску прайшла міжнародная канферэнцыя «Адукацыя дарослых для дасягнення Мэтаў устойлівага развіцця». Яе арганізавала Прадстаўніцтва зарэгістраванага аб'яднання «Deutscher Volkshochschul-Verband e.V.» (ФРГ) у Рэспубліцы Беларусь. Мерапрыемства было прымеркаванае да 100-годдзя народных універсітэтаў у Германіі, 50-годдзя DVV International і 10-годдзя DVV International у Беларусі. На мерапрыемства (а па сутнасці – нават на сустрэчу дзеля абмену напрацаваным досведам) сабраліся не толькі беларускія адмыслоўцы, але і прадстаўнікі краінаў ад Паўднёвай Карэі да Шатландыі, ад Скандынавіі да Узбекістана і Балканаў – блізу 30-і краінаў Еўропы і Азіі.

Першы дзень канферэнцыі быў прысвечаны рэтраспекцыі. Рэферэнт DVV International па Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропе, Турцыі і Каўказе Леван Квачадзэ распавёў аб поспехах аб'яднання ў рэгіёне, які курыруе, пра асаблівасці працы арганізацыі ў розных краінах. Прафесар Х. Хінцэн пазнаёміў з развіццём народных універсітэтаў у яго краіне і з паўвекавой гісторыяй сваёй арганізацыі. Скончыла першы дзень Галіна Верамейчык, кіраўнік беларускага Прадстаўніцтва аб'яднання. За гэты час многае адбылося і змянілася. Вось узяць хаця б такую згадку: «Калі мы рэгістравалі Прадстаўніцтва, перакладалі дакументацыю з нямецкай мовы. І на той час не было афіцыйнага словазлучэння "адукацыя дарослых". Перакладчыцкія канторы пісалі толькі "павышэнне кваліфікацыі". Складана было тлумачыць, што гэта – не тое, што мае на ўвазе DVV. Цяпер жа "адукацыя дарослых", як і сама неабходнасць яе, ужо не выклікае пярэчанняў і ўдакладненняў».

(Заканчэнне на стар. 3)

Памяць, занатаваная на камянях



Вядома, што шматлікія камяні на нашай зямлі з'явіліся ў выніку сожскай стадыі дняпроўскага абледзянення каля 100 – 120 тысячаў гадоў таму. Паверхня зямлі шчодра засеяная дробнымі і вялікімі валунамі, прынесенымі ледавіком з поўначы, – Швецыі, Фінляндыі, Карэліі, дна Балтыйскага мора.

Камяні з'яўляюцца помнікамі прыроды і калісьці выконвалі культавыя функцыі – ім пакланяліся продкі. Да такіх сакральных аб'ектаў адносяцца камяні-следавікі. Звычайна гэта невялікія валуны, выемкі на якіх нагадваюць сляды чалавека або якой-небудзь жывёлы. Гэта прыродныя паглыбленні, дзе збіраецца дажджавая вада, якая паводле народных павер'яў дапамагае ад розных хваробаў. Следавікам яшчэ і ў наш час носяць ахвяры – манеты, зеляніну, кветкі, ставяць свечкі. Як бачна, водгулле язычніцкіх традыцыяў вельмі жывучае.

Цяпер засяродзім увагу на выявах, зробленых рукою чалавека на камянях – помніках эпіграфікі.

(Заканчэнне на стар. 5)

Сябры! Заканчваецца падпіска на I паўгоддзе 2020 г. на «Краязнаўчую газету». Калі ласка, не адкладайце падпіску на апошні дзень. І вядома ж – далучайце новых сяброў!

Толькі разам мы зможам захаваць адзіную ў беларускай дзяржаве газету, якая цалкам прысвечаная разнастайнасці рэгіёнаў, іх адметнасці і ўнікальнасці. Газету, якая ўжо амаль 17 гадоў распавядае пра ВАШЫЯ мясціны зацікаўленым у РОЗНЫХ кутках Беларусі.

Беларусь у рамантычных краявідах

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі 12 снежня адкрылася выстава «Святло і паветра», дзе прадстаўленыя творы выдатнага майстра краявідаў, беларускага жывапісца Пятра Шарыпы (1942 – 2013).

На працягу амаль саракагадовага творчага шляху П. Шарыпа звяртаўся да розных жанраў жывапісу: партрэт, тэматычная карціна, нацюрморт. Але самымі эмацыянальнымі і запамінальнымі яго палотнамі сталі менавіта пейзажы.

Рамантычны краявід – найбольш выразны кірунак у творчасці тонкага і інтэлігентнага майстра пэндзля. Ён працягваў традыцыі беларускіх пейзажыстаў, якія развівалі Фердынад Рушчыц, Вітольд Бялыніцкі-Біруля, Станіслаў Жукоўскі.

Дзіця вайны, П. Шарыпа зведаў жыццё ў лясной зямлянцы і голад, узрос уражлівым, прагным да ведаў. Вучань Арэхаўскай школы Віцебскай вобласці сямігадовы Пятрок захапіўся каляровымі рэпрадукцыямі Куінджы і Левітана на вокладках першых пасляваенных падручнікаў і імкнуўся навучыцца маляваць.

У 1960 годзе ў Віцебску паступіў на мастацка-графічны факультэт педінстытута, некаторы час працаваў настаўнікам у вёсцы. Потым было навучанне ў Дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце ў Мінску ў такіх майстроў і настаўнікаў, як Хаім Ліўшыц, Май Данцыг, Натан Воранаў. Вывучаючы сродкі выразнасці, ён выпрацоўваў свой жывапісны стыль.

Выезды на пленэры ў розныя куткі Беларусі, шматгадзінныя назіранні за зменамі ў прыродзе – свячэннем паверхні азёраў і рэчак, дыханнем паветра, фарбамі кветак – наталялі душу, дазвалялі авалодаць сакрэтамі майстэрства.

Чулы педагог Пётр Пятровіч больш за трыццаць гадоў выкладаў у Рэспубліканскім каледжы мастацтваў імя І. Ахрэмчыка і далучаў сваіх выхаванцаў да рэалістычных традыцыяў мастакоў мінулага, такіх як І. Шышкін, І. Левітан, К. Каровін. Шмат таленавітых дзяцей прайшло праз яго майстэрню, дзе сваю манеру пісьма і свой шлях знайшлі яго вучні Алесь Пушкін, Ларыса Журавовіч, Аляксандр Сільвановіч і інш.

У арганізацыі выставы шмат дапамагала дачка творцы Алена Шарыпа, таксама таленавіты жывапісец. Свае першыя малюнкі яна пачала ствараць, назіраючы за татам у бабулінай вёсцы на Віцебшчыне. З 14-і гадоў падарожжы на Аршаншчыну, у Крэва, Браслаў, Слабодку прывілі ёй любоў да беларускага архітэктурнага краявіду.

Выстава «Святло і паветра» прымеркаваная да Года малой радзімы. На ёй прадстаўленыя працы, выкананыя Пятром Пятровічам выключна з натуры на пленэрах. Ціхае замілаванне роднай прыродай адчуваецца ў някідкіх, але душэўных творах «Вясновая вада», «Азёрны край», «Блакітны дзень. Слабодка», «Вясновы блакіт» і інш.

Павадле аддзела сувязяў з грамадскасцю НББ

Невядомае аб вядомым з дзяцінства

12 снежня ўдзельнікі аматарскага аб'яднання «Чамучкі-ўсёзнайкі» Мураванскай сельскай бібліятэкі сабраліся на гістарычны экскурс «Ведаць гісторыю свайго роднага краю». Бібліятэкар правяла агляд выставы «Шчучыншчына – мой родны кут», арганізаванай да 80-годдзя ўтварэння раёна, а потым усе разам адправіліся на экскурсію ў царкву Нараджэння Божай Маці. Дзеці даведаліся пра таямніцы Мураванскай царквы-крэпасці, гісторыю яе пабудовы і асаблівасці архітэктуры.

Марыя СЯМАШКА, бібліятэкар Мураванскай сельскай бібліятэкі, Шчучынскі раён

Апошнім часам нашыя падпісчыкі з розных рэгіёнаў Беларусі пачалі звяртацца да нас з пытаннямі, чаму яны не атрымалі той ці іншы нумар «Краязнаўчай газеты». Вы ведаеце, сябры, што распаўсюдам займаецца РУП «Белпошта»; мы ж са свайго боку імкнемся выканаць усе абавязкі перад падпісчыкамі – выпускаем УСЕ нумары газеты. Калі ласка, **звяртайцеся** *ў свае аддзяленні паштовай сувязі*, а таксама **інфармуйце** *рэдакцыю і БФК аб тым, дзе і хто не атрымаў* пэўны нумар газеты. Мы таксама звяртаемся да распаўсюднікаў з просьбаю разабрацца, і са свайго боку просім у падпісчыкаў разумення гэтай сітуацыі.

Майце таксама на ўвазе, што «Краязнаўчая газета» будзе выходзіць і ў 2020 годзе, на яе можна падпісвацца да 25 чысла кожнага месяца.

На тым тыдні...

✓У Дзень правоў чалавека ў сталічным кінатэатры «Піянер» прайшла **цырымонія закрыцця Фестывалю фільмаў «Человеческое достоинство, равенство и справедливость». 10 снежня** ў холе кінатэатра была разгорнутая выстаўка, складзеная з матэрыялаў архіва ААН і прысвечаная артыкулам Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, можна было атрымаць асобнікі Дэкларацыі на беларускай і рускай мовах. На мерапрыемстве выступілі Пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Іаана Казана-Вішнявецкая і пасол Швецыі ў нашай краіне Крысціна Юханессан. Потым адбыўся паказ нарвежска-дацка-шведскага фільма «Саамская кроў».

✓**12 снежня** ў выставачнай зале Музея гісторыі беларускага кіно – філіяла Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь – адкрылі выстаўку са збору Дзяржаўнага цэнтральнага музея сучаснай гісторыі Расіі **«Горад над вольнай Нявой»**, дзе прадстаўленая блакадная графіка мастака Аляксандра Блэка. У калекцыі музея захоўваецца графічная серыя А. Блэка, у якой тушшу, бяліламі і акварэллю ў блакадным Ленінградзе ва ўмовах холаду, недаядання, бесперапынных бамбёжак і абстрэлаў захаваныя падзеі першых дзесяці месяцаў вайны. Многія малюнкі выкананыя ў халодных шэра-блакітных танах колеру ленінградскага снегу, у брудна-вохрыстых адлівах начнога зарыва над палаючым горадам, у выстуджаных, асветленых газоўкамі пакоях. Героі серыі – вялікі горад і яго жыхары, якія гінуць, але не здаюцца.

Графіка А. Блэка стаіць у адным шэрагу з вершамі В. Бергольц, музыкай Д. Шастаковіча ды інш. мастацкімі творамі, створанымі ў дні блакады.

✓**13 снежня** ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага прайшло **адкрыццё міжнароднай выстаўкі сучаснага мастацтва «МІНСК – ПАРЫЖ»**. Яна арганізаваная сумесна з беларуска-французскай асацыяцыяй «Беларусь – Францыя. Абмен» пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Беларусь у Французскай Рэспубліцы.

Прадстаўленыя пад сотню твораў жывапісу, графікі, скульптуры, арт-аб'ектаў беларускіх і французскіх мастакоў. Іх аб'ядноўвае ўдзел у адным з самых прэстыжных парыжскіх салонаў «Art Capital». Сярод беларускіх аўтараў – народны мастак Беларусі Уладзімір Тоўсцік, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Валерый Шкаруба, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Віктар Альшэўскі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва Глеб Отчык. Французскі бок прадстаўляюць 25 аўтараў (сярод іх прэзідэнт «Салона Малюнка і Акварэлі» Даніэль Гале, кіраўнікі групаў Салона «Параўнанне» Ален Кампело, Франсуа Лёгран, Лукаш Кандл, Жан Порт).

Выстаўка працуе да 19 студзеня 2020 г.

✓Нядаўна закончылася рэалізацыя праекта **«Брэндынг аг. Германавічы як інструмент устойлівага развіцця: агульнымі намаганнямі для ўсіх»** у Шаркаўшчынскім раёне (падтрыманы Пасольствам ЗША ў Беларусі). **13 снежня** ў будынку райвыканкама прайшло апошняе мерапрыемства: круглы стол «Музей, праект і грамадства: перазагрузка» сабраў удзельнікаў праекта. Агульную інфармацыю пра рэалізацыю праекта дала кіраўнік праекта, дырэктар сацыяльна-інфармацыйнай установы «Традыцыі і інавацыі Паазер'я» Надзея Дударонак, якая расказала аб выніках больш за 20 праведзеных мерапрыемстваў, на якія мэты быў накіраваны праект і ці прыйшлі да чаканых яго вынікаў. Як праект паўплываў на жыццё музейнай сферы рэгіёна, расказала дырэктар Мастацка-этнаграфічнага музея імя Я. Драздовіча Людміла Навіцкая. Паведаміла яна і пра тое, ці адыграў брэнд «імя Драздовіча» на паспяховае развіццё музея і Германавічаў.

У мерапрыемстве бралі ўдзел намеснік старшыні Шаркаўшчынскага райвыканкама Ю. Васілеўскі, прадстаўнік Аддзела інфармацыі, культуры і адукацыі Пасольства ЗША Г. Паўлоўская, работнік Віцебскага аблвыканкама А. Астаніна, галоўны захавальнік фондаў Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў Г. Базарэвіч.

✓**13 снежня** Літаратурны музей Петруся Броўкі запрасіў на **прэзентацыю новай кнігі Валянціны Аксак «Кава ў арліным гнязьдзе»**. Паэтэса, журналістка, член Саюза беларускіх пісьменнікаў, лаўрэат прэміі «Залаты апостраф» (2008) выдала шэраг кніг паэзіі («Віно з Каліфорніі», «Дзікая сьліва», «Завінены рай» ды інш.). У новай кнізе – амаль поўнае зліццё аўтарскага голасу з навакольнымі гукамі: шаргаценнем лістоты, яблыкападам, рэхам здзічэлых садоў. Але найперш – з птушынымі спевамі. Дзякуючы аздабленню мастака Генадзя Мацура кніга зацікавіць нават тых, хто не чытае вершаў. Графіка слыннага майстра не проста дакладна перадае ўнутраную сутнасць словаў, а ўспрымаецца як галерэя самастойных мастацкіх твораў.

На імпрэзе выступілі філосаф Валянцін Акудовіч, старшыня СБП Барыс Пятровіч, літаратурны крытык Ціхан Чарнякевіч, рэдактар кнігі Аляксандра Макавік, мастак Генадзь Мацур.

Веды і адукацыя – *цягам і глыбінёю жыцця*

Прафесар доктар Хэрыберт Хінцэн, які нядаўна быў у нашай краіне, збірае прыказкі і прымаўкі розных народаў пра адукацыю, пра веды. Зацікаўленасць у яго, можна сказаць, прафесійная: ён экс-дырэктар DVV International, Ганаровы стыпендыят Інстытута ЮНЕСКА навучання цягам усяго жыцця. Ганаровы госць папрасіў папоўніць калекцыю і нашых суайчыннікаў. І вось жа: апроч «Век жыві – век вучыся» і працягу пра «дурнем памрэш» мала што прыходзіла ў галовы тым, хто сабраўся. А людзей было пад сотню, і ўсе – актывісты, якія займаюцца акурат адукацыяй дарослых (АД), нефармальнай адукацыяй. Няўжо ўсё так кепска, і нашыя людзі спрадвеку не лічаць адукацыю каштоўнасцю, спосабам змяніць жыццё да лепшага? Акурат пра тое і ішла гаворка цягам двух дзён.



Хэрыберт Хінцэн

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Другі дзень пасля афіцыйных вітанняў ад прадстаўнікоў беларускіх уладаў і замежных гасцей пачаўся з даклада дарадцы ўпраўлення ўстойлівага развіцця Галоўнага ўпраўлення шматбаковай дыпламатыі МЗС Рэспублікі Беларусь Мікалая Дзівакова «Беларусь на шляху да Мэтаў устойлівага развіцця (МУР)». Ён зазначыў, што ў маі 2017 г. прайшла Нацыянальная канферэнцыя па дасягненні МУР, амаль год таму прайшоў Нацыянальны форум па МУР, цяпер працуюць агульнанацыянальная і рэгіянальныя групы ва ўсіх рэгіёнах. Старшы праграмны каардынатар Інстытута ЮНЕСКА навучання цягам усяго жыцця доктар Амір Пірыч выступіў з дакладам «Зробім навучанне на працягу ўсяго жыцця рэальнасцю: навучанне і адукацыя дарослых у праграмных дакументах ЮНЕСКА». І навучацца цягам жыцця могуць не толькі асобныя людзі і групы ахвочых. Пра гарады, што навучаюцца, распавёў прафесар доктар Майк Озбарн, дырэктар па даследаваннях «Школы адукацыі» Універсітэта Глазга (Шатландыя). «Гарады мусяць выбіраць накірункі адукацыі сваіх грамадзянаў адпаведна рэгіянальным асаблівасцям, – зазначыў выступоўца. – А таксама – адукацыя павінна быць агульнаю для ўсіх грамадзянаў і агульнадаступнаю розным групам. Толькі 41 краіна займаецца навучаннем людзей цягам усяго жыцця». Сапраўды, «век жыві...»

Цікавыя паведамленні прагучалі і пад час дыскусіі «Адукацыя дарослых у Беларусі: на шляху да ўстойлівасці». Удзел бралі намеснік начальніка ўпраўлення палітыкі занятасці – начальнік аддзела рынка працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алёна Дакукіна, прарэктар па навучальнай працы Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі кандыдат педагагічных навук Алена Касьянік, прарэктар па навучальнай працы Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы кандыдат фізіка-матэматычных навук Вячаслаў Шупляк ды інш. Прагучала заклапочанасць даступнасці дадатковай, нефармальнай адукацыі акурат у рэгіёнах. Там, лічаць выступоўцы, мясцовае кіраўніцтва павінна дбаць аб гэтым, браць на сябе ініцыятыву. Як прыклады былі прыведзеныя праекты «Масты пакаленняў», «Яйкі вучаць курыцу», «Універсітэт 50+», цэнтры адукацыі дарослых у Браславе і Дзяржынску ды інш. месцах краіны.

Некалькі гадзінаў было аддадзена тэматычным секцыям, што праходзілі адначасова ў розных залах. Было прапанавана абмеркаваць пытанні і праблемы АД для экалагічнай устойлівасці, для дасягнення эканамічнага росквіту і дабрабыту, для паляпшэння якасці жыцця і паслядоўнага развіцця асобы, для інавацыйнай будучыні. Тут разам з беларускімі адмыслоўцамі і экспертамі выступілі замежныя госці.

Ваш карэспандэнт абраў трэцюю секцыю – аб развіцці асобы. Мадэратарам была расійская незалежны эксперт па адукацыі дарослых Вольга Агапава (дарэчы, аўтар нядаўна выдадзенага ў Беларусі метадычнага дапаможніка па адукацыйнай працы «Стареть? Нет времени!»). Напачатку досведам падзялілася актывістка DVV International з Узбекістана Ірына Разілава. Далей выступілі Вольга Басарымава (Краснапольскі цэнтр дадатковай адукацыі дарослых «СОВ@»), Ларыса Быцко (культурна-адукацыйны цэнтр «Вясковы рэнесанс», Пружанскі раён), Ірына Багданец (ПУ «Территория развития – 21 век»), Дзмітрый Субцэльны (Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА), Яўген Барышнікаў (Студэнцкае этнаграфічнае таварыства), Андрэй Цыбульскі (сябра Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў з Віцебска).

Вольга Агапава

Цікавым падаецца выказванне ўдзельніцы з Узбекістана: «Адукацыю павінны атрымліваць дарослыя: Усе. Заўсёды. Паўсюль. І яна павінна быць даўжынёю жыцця – шырынёю – і глыбінёю ўсяго жыцця. Хаця, на жаль, у афіцыйную статыстыку неафіцыйная адукацыя для дарослых не трапляе». Аб досведзе працы ў рэгіёне, масава адселеным пасля Чарнобыльскай катастрофы, распавяла ўдзельніца з Краснаполля. Людзі, якія засталіся там, імкнуцца жыць паўнавартасным жыццём, спасцігаць новае, спрабаваць новае. У раёне стварылі курсы прыгажосці, спартыўныя, вучылі індывідуальнаму прадпрымальніцтву. А навучэнцы ландшафнаму дызайну як «выпускную працу» правялі добраўпарадкаванне цэнтральнага гарадскога сквера. А ў знікаючай вёсцы Стойлы на Пружаншчыне Л. Быцко з аднадумцамі ў 2014 г. стварылі культурна-адукацыйны цэнтр і назвалі яго «Вясковы рэнесанс». Кола заняткаў – традыцыйныя рамёствы, спевы, танцы, абрады і святы, а разыначкаю лічаць сямейны тэатр батлейка («Муж у мяне – заслужаны артыст вёскі Стойлы», – жартуе спн. Быцко). Навучаюць тут разьбярству і спіральнаму пляценню з саломы. Яшчэ ў адным малалікім раёне – Кармянскім – стварылі ўнікальны фэст «Льняная карусель», цягам года вырабляюць сувеніры з ільну. Даведаліся аб тым у Пасольстве Аўстрыі ў Беларусі, завітаў Пасол. А ў выніку – адбылося абмеркаванне на дзяржаўным узроўні пытанняў інвеставання і развіцця Кармянскага ільнозавода.

І прыкладаў, калі ініцыятыўныя людзі навучаюцца самі і падцягваюць землякоў на новыя вышыні, па краіне багата. Аб гэтым ішла гаворка пад час абмеркавання вынікаў працы секцыяў. Але, зазначыў Віталь Нікановіч (Лабараторыя інавацыйных праектаў), чым далей ад Мінска, тым меней у людзей імпэту, зацікаўленасці, імкнення навучацца. А яшчэ існуе праблема малой ступені нефармальнага сумоўя, кантактаў і абмену досведам між супольнасцямі і рэгіёнамі. Яго падтрымала Сафія Савелава (асацыяцыя «Адукацыя для ўстойлівага развіцця»): «У нас няма звычкі перадаваць веды тут і цяпер. Тэхналагізацыя ні да чаго не прывядзе, калі не будзе спалучацца з сацыяльнымі падыходамі, калі людзі не будуць дзяліцца свамі ведамі, адказваць за іншых, працаваць у партнёрстве».

Выснова з канферэнцыі такая: мы павінны зрабіць так, каб найлепшыя людскія рэсурсы былі ўцягнутыя ў навучанне дарослых, у пабудову лепшай будучыні – не толькі ў сваёй дзяржаве, але і на сваёй планеце. Добра, калі мясцовыя партнёры (дзяржаўныя і грамадскія) разумелі гэта, і падтрымлівалі (у тым ліку – матэрыяльна).

Пад час першага дня канферэнцыі

Вольга Басарымава

Ларыса Быцко

Уладзімір ПУЧЫНСКІ
Фота Андрэя КАТА
(прадастаўленае DVV International у Беларусі)

І тчэ жыццё гадоў палотны

У маіх родных Рэдкавічах няма, на жаль, помнікаў гісторыі, ды і значных падзеяў не адбывалася. Таму галоўным багаццем вёскі з'яўляюцца мае паважаныя землякі. Пра адну з іх мне сёння хочацца расказаць на старонках «КГ».

Нядаўна ўдзельнікі дзіцячага аматарскага аб'яднання «Сінязорка», што ўжо больш за 10 гадоў працуе пры Рэдкавіцкай сельскай бібліятэцы, завіталі да Вольгі Мікалаеўны Ярмак, каб пагутарыць.

Нашаму прыходу сталая жанчына вельмі ўзрадавалася і ахвотна згадзілася расказаць пра свой жыццёвы шлях.

– Дзякуй Богу, мае даражэнькія, што вы не ведаеце вайны, – было першае, што ўсхавалявана прамовіла Вольга Мікалаеўна, і на яе вачах адразу выступілі слёзы. – Спакойнае жыццё – самая вялікая каштоўнасць для ўсіх нас.

Нарадзілася жанчына ў шматдзетнай паважанай сям'і ў Рэдкавічах у 1932 годзе. Тут прайшло яе дзяцінства, якога амаль пазбавіла вайна, бо ў поўнай меры зведала і холад, і голад, і страх. Тут прайшла цудоўная пара маладосці. Тут напаткала адзінокая старасць.

Нацярпелася сям'я ў гады акупацыі: і немцы ў хату заходзілі, і людзі, якія выдавалі сябе за партызанаў, забіралі ўсе прадукты з хаты, не цураліся і вопраткі.

Напрыканцы 1943 года Любанскі райваенкамат прызваў на ваенную службу і бацьку Вольгі. Па-геройску змагаўся з чужынцамі наш зямляк, дайшоў да Берліна. За салдацкую мужнасць, гераізм і няскоранасць ворагу Мікалай Ярмак быў узнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі. Потым, з цяжкасцю дабраўшыся да родных Рэдкавічаў, не пазнаў герой некалі прыгожую вёску: яна амаль уся была спаленая немцамі – за сувязь жыхароў з партызанамі, не ўцалела і іх хата. Убачанае адгукнулася болем у сэрцы земляка, але ён не апусціў рукі. Пабудаваў прасторную хату, завялі з жонкай вялікую гаспадарку, гадавалі дзяцей.

Мікалай Пятровіч працаваў сакратаром Рэдкавіцкага сельскага Савета, жонка Марыя Пятроўна рупілася ў паляводчай брыгадзе мясцовага калгаса.

– Мая матуля заўсёды была галоўнай у сям'і, – з усмешкай гаворыць мая суразмоўца. – Хата, гаспадарка, зямельны надзел – усё было афармлена на яе. Мае бацькі вельмі шанавалі адно аднаго, заўсёды жылі ў згодзе, раіліся паміж сабой. У павазе і любові адзначылі 70-гадовы юбілей сумеснага жыцця. На вялікі жаль, у 1996 годзе абодва пакінулі гэты свет.

Вельмі цяжка было Вользе Мікалаеўне перажыць раставанне з самымі роднымі людзьмі – бацькамі. Увесь час яна жыла з імі, але нічога не зробіш: на гэтым трымаецца свет – не памірае толькі той, хто не нарадзіўся.

Яшчэ не было дзяўчыне і пятнаццаці гадоў, як пайшла працаваць у калгас «Чырвоная змена», маючы за плячыма толькі пачатковую школу. Па 40 сотак калгасных буракоў з морквай адмервалі на двор, і толькі апрацуеш апошнюю норму, як першая ўжо зноў зарасла. Лёну таксама многа сотак трэба было вырваць за дзень, звязаць у снапы перавяслам, паставіць у бабкі, а як прасохне – абмалаціць семя, паслаць роўнымі радочкамі, каб добра адляжаўся, зноў звязаць у снапы і скласці ў скірды. Хто працаваў сем'ямі, у таго шпарчэй было, а адной вельмі цяжка даводзілася. Вечарамі маладзіца не адчувала рук, ногі невыносна гулі, але ноч вяртала сілы.

– Усяго хапала за жыццё, – прызнаецца Вольга Мікалаеўна. – У той час вельмі сур'ёзна ставіліся да працы ў калгасе. Таму кожную раніцу яшчэ даводзілася бегчы па нарад, бо варта спазніцца – і ўсё, застаўся без працы. У брыгадзе было больш за трыццаць калгаснікаў. Адпрацавала я на паляводстве амаль сорак гадоў, ад праўлення калгаса не раз атрымлівала каштоўныя падарункі за сумленную працу.

Даводзілася працаваць на калгасных палях з ранняй вясны да позняй восені, да таго ж у любое надвор'е. Толькі зімою можна было крыху адпачыць ад цяжкай фізічнай працы. Самым любімым заняткам для В. Ярмак было ткацтва. Вельмі прыгожыя ў яе атрымліваліся посцілкі-перабіранкі з суконных фарбаваных у розныя колеры нітак.

– У Рэдкавічах бытавала даўняя традыцыя, – прыпамінае Вольга Мікалаеўна, – збірацца на вячоркі. Ладзіліся яны звычайна з Піліпаўкі, і аж да Вялікадня. Пастаяннай хаты для пасядзелак не было – па чарзе хадзілі то да адных гаспадароў, то да другіх. На вячорках руплівыя вяскоўкі займаліся працай па душы: пралі кудзелю, дралі пер'е, вышывалі, вязалі, а мужчыны выраблялі прылады працы, плялі лапці. Дружна працавалі ўсе, таму і песні тут складваліся, розныя атрымліваліся – і сумныя, і вясёлыя, але такія сардэчныя, не тое што цяпер. Вельмі радаваліся, калі ў хату заходзіў ладны вясковы гарманіст Павел Бусел – такая ў яго была мянушка за высокі рост. Ніхто з прысутных не мог уседзець на месцы пад вясёлую беларускую не толькі полечку, але і кракавяк, падыспан. Толькі пад раніцу ўсе разыходзіліся па сваіх хатах з песнямі.

Доўга яшчэ магла б расказваць пра мінулае паважаная зямлячка, ды ўжо надыходзіла змярканне, таму «сінязораўцы» зазбіраліся дамоў.

Нягледзячы на сталы ўзрост Вольга Мікалаеўна, як і кожная жанчына, любіць кампліменты. Старанна пазіруе для фота, на рэпліку: «Усміхніцеся, вы такая прыгожая» смяецца і какетліва ўдакладняе: «Была калісьці, таму і кавалеры сваталіся».

Дарэчы, добрым словам яна ўспамінае свайго сябра з Любані Міхаіла Раменчыка, які ва ўсім дапамагаў адзінокай жанчыне. Хоць і сустрэліся яны, калі абодвум было ўжо больш за сорак гадоў, думалі, што зладзяць сям'ю, але, на жаль, не склалася, нездарма ж у народзе гавораць: «У кожнага свой лёс і сваё апраўданне».

– Нялёгка мне цяпер, – прызнаецца бабуля, – пакуль магла прыглядала за сваім домам і гаспадаркай. Аднак рабіць гэта з кожным годам усё цяжэй і цяжэй. Можа, каб былі ў мяне дзеці, дык дапамаглі б. Цяпер мне дапамагае брат з браціхаю ды сацыяльны работнік – працавітая маладзіца Святлана Кругленя, яна мне як родная дачка. Ды і сама не люблю сядзець без справы. Летам амаль увесь дзень праводжу на агародзе. Дзе што пасажу, дзе зелля вырву, восенню яблыкі збіраю, каб не гнілі пад дрэвамі, гарбузікі выбіраю і сушу. Адным словам – рухаюся.

На зіму жанчына пераедзе ва Урэчча, дзе знаходзіцца аддзяленне кругласутачнага пражывання грамадзянаў пажылога ўзросту і інвалідаў Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Любанскага раёна, а з наступленнем вясны зноў вернецца ў родную бацькоўскую хату.

Напрыканцы сустрэчы «сінязораўцы» пажадалі паважанай зямлячцы доўгага веку, моцнага здароў'я, бадзёрасці, каб сілаў на ўсё хапала.

Марыя СЛІВЕЦ,
бібліятэкар Рэдкавіцкай сельскай бібліятэкі,
Любанскі раён

Памяць, занатаваная на камянях

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Рэч у тым, што жыхар Івянца Альфонс Жаўток выканаў сваю хрысціянскую місію – знайшоў і ўпарадкаваў 33 магілы на забытым старажытным цвінтары ў лесе каля вёскі Пагарэлка. У далёкім маленстве, пасучы кароваў у гэтых мясцінах, ён заўжды памятаў наказ бацькоў: «Каб скаціну, крый Божа, не пушчалі на могільнік». Гэтае сакральнае месца вылучалася адметнымі таямнічымі камянямі з выбітымі незразумелымі знакамі, літарамі і крыжамі. Ніхто з мясцовых доўгажыхароў не ведаў, хто тут пахаваны і калі. Хадзілі чуткі, што гэта магілы французаў, шведаў або маскавітаў. Але да некропаля ставіліся з пашанай, падтрымлівалі ў парадку, наведвалі на рэлігійныя святы.

Дарога з Скіпароўцаў на Івянец праходзіла паўз гэтыя помнікі, дзе непадалёк на скрыжаванні з трактам Мір – Вільня стаяла старасвецкая карчма. У пасляваенны час занадта «тэмпераментны» старшыня калгаса «Рассвет», каб спраміць шлях, вырашыў праз могілкі пракласці дарогу. Вандал так і зрабіў. Каменныя пліты былі зрынутыя і засыпаныя слоем пяску.

Дзякуючы самаахвярным намаганням Альфонса Станіслававіча гэты помнік археалогіі часткова адроджаны. Тут ладзяць экскурсіі. Цікавасць люду ўзрасла да такой ступені, што аматары даўніны паведамляюць усё новыя і новыя каардынаты аб месцах знаходжання загадкавых «графіці».

Напрыклад, вядомы нумізмат і аматар археалогіі Валерый Мазура выявіў падобны аб'ект у ваколіцы вёскі Рудня Івянецкая. Аналізуючы аднатыпнасць знакаў, мы аднадушна прыйшлі да высновы, што маем справу з таямнічымі рунамі, якія часта сустракаюцца не толькі на валунах, але і на ўзорах ткацтва, жаночых упрыгожаннях, фрагментах керамікі.

Выявы на камянях падзяляюцца на асобныя літары, лігатуры, ідэаграмы, крыжыкі. Яны маюць падабенства з скандынаўскай рунічнай пісьменнасцю. Вядома, што святыя тэксты арыяніў Палаб'я і Памор'я пісаліся рунічным пісьмом. Арыянства – асобная плынь у хрысціянстве, якая адмаўляла дагмат аб адзінстве Бога-Бацькі і Бога-Сына (Хрыста), за што была асуджаная як ерась царкоўнымі саборамі яшчэ ў IV стагоддзі. Рунічная літаратура, незразумелая каталіцкім служкам, знішчалася як праява д'ябла. З пашырэннем хрысціянства рунічнае пісьмо было выцесненае лацінскім. Ватыканам абвяшчаліся крыжовыя паходы

на славянскія землі Палаб'я і землі заходніх балтаў Парусся (Прусію), а потым і на Вялікае Княства Літоўскае.

Аднойчы аўтарытэтны краязнаўца, уладар аграсядзібы «Налібоцкія васількі» Васіль Шакун прапанаваў супольна наладзіць экскурсію для замежных гасцей. Разам мы наведалі сакральныя аб'екты каля Пагарэлкі і Рудні, на скрыжаванні дарог з Сівіцы на Пілюжыну і з Вуглоў на Дайнаву, камяні каля вёскі Гілікі і ў Праўжалах. Грамадзянін Германіі, які па кудзелі паходзіць з Івяннеччыны, Пётра Канечны ўпэўнена заявіў: «Гэтыя помнікі – сляды вікінгаў. Такія камяні ў вялікай колькасці сустракаюцца ў Нямеччыне і Швецыі, дзе шануюцца і знаходзяцца пад дзяржаўнай апекай». Што ж, гэтае меркаванне можна лічыць як адну з версіяў у нашых даследаваннях.

Ваяўнічыя дружыны з Скандынаўскага паўвострава на караблях, упрыгожаных галовамі драконаў (дракарах), наводзілі жах на ўсіх жыхароў прыбярэжнай Еўропы, Ісландыі, Грэнландыі і Паўночнай Афрыкі. Шведскія вікінгі па рэках накіроўваліся да Чорнага і Каспійскага мораў, пагражалі Канстанцінопалю і берагам Персіі. Пачынаючы з канца VIII стагоддзя цягам трохсот гадоў яны рабавалі насельніцтва і прадавалі палонных у рабства. Вікінгі назапасілі велізарныя скарбы золата і срэбра, аб якіх засталіся толькі легенды ды сагі пра «вялікі водны шлях з варагаў у грэкі». Ва Усходняй Еўропе іх называлі варагамі і русамі.

Адзін з лакальных маршрутаў «з варагаў у грэкі» праходзіў праз нашую зямлю: Балтыйскае мора – рака Нёман – рака Іслач – рака Пціч – рака Прыпяць – рака Дняпро – Чорнае мора. Падымаліся вікінгі з Нёмана і па рацэ Уса, праз волак каля Шыкуцёў траплялі ў рэчку Волма, а потым па цячэнні спускаліся ў раку Іслач. Аб гэтым сведчаць старажытныя артэфакты на берагах рэк. Вось адкуль выпадковыя археалагічныя знаходкі ў выглядзе манетаў або рарытэтаў з рунічнымі знакамі.

У нашым краі гвалту і рабунку мясцовага насельніцтва з боку вікінгаў у пісьмовых крыніцах не зафіксавана. Але засталіся сляды доўгачасовых стаянак і могільнікі. Магчыма, гэта абумоўленае агульнасцю паходжання ад старажытных плямёнаў паўночна-індаеўрапейцаў, падобнасцю моваў і менталітэту.

Нельга пагадзіцца з тымі, хто лічыць, што крыж – толькі праява хрысціянства. Крыжам пакланяліся людзі ад пачатку цывілізацыі на ўсіх кантынентах як сімвалу сонца. Крыж – гэта і сістэма каардынатаў, якая дае магчымасць чалавеку арыентавацца ў прасторы і часе. На працягу стагоддзяў выява крыжа атрымала шмат стылявых варыяцыяў, розных па форме і змесце.

На крыжы быў закатаваны Хрыстос. Але першым знакам хрысціянаў была выява рыбы, іхтыс. Камень з паглыбленай выяваю рыбы можна пабачыць каля вёскі Гілікі, яе выбілі ў пачатку XIII стагоддзя місіянеры-дамініканцы, паплечнікі Святога Яцака Адрованжа.

Прыгадваецца яшчэ паданне, занатаванае ў вёсцы Сівіца археолагам Людмілай Дучыц, наконт камянёў на скрыжаванні дарог. Два хлопцы былі закаханыя ў адну прыгажуню. Дзяўчына сказала: «Хай адзін ідзе ў Івянец і прынясе абаранак, а другі хай ідзе да рэчкі Волкі, зловіць рака і прынясе мне. Хто першы прынясе падарунак, за таго і пайду замуж». Закаханыя прынеслі падарункі адначасова, але, аддаючы іх, адначасова і памерлі. Людзі пахавалі хлопцаў, а дзяўчыну закапалі жывой. Таму тут ляжаць тры камяні, растуць дзве сасны, а пасярэдзіне бяроза.

Сярод «графіці» сустракаюцца выбітыя даты «1863». Магчыма, гэта магілы паўстанцаў-каліноўцаў, бо іх хаваць на могілках забаранялася акупацыйнымі ўладамі.

А вось у Кульшычах каля прыдарожнага крыжа захоўваецца камень з пазнакай «1794». Мабыць, гэта зафіксаваныя падзеі паходу аддзела Міхала Клеафаса Агінскага ў нашую старонку.

P.S. Пакуль рыхтаваўся гэты тэкст, няўрымслівы А. Жаўток ужо добраўпарадкаваў мемарыял каля вёскі Рудня. Вялікі дзякуй яму за гэта!

Алег РАМАНОЎСКІ,
г.п. Івянец

Нашы віншаванні

Жыцці дзеля Айчыны

Бывае, чалавеку ўдаецца пражыць два жыцці. А вельмі рэдка – тры і болей. Да такіх адносіцца* Алег БЕМБЕЛЬ*, паэт, філосаф, публіцыст, музыка. Ён нарадзіўся ў Мінску 16 снежня 1939 г. у сям'і скульптараў Андрэя Бембеля і Вольгі Дзядок. Разам з маці і сястрой Кларай перажыў Вялікую Айчынную вайну ў Мінску.

Свецкім людзям вядомы як сын скульптара, выпускнік кансерваторыі, аспірант Інстытута філасофіі, апроч таго – нацыяналіст, выгнаны з кампартыі. Боскім шляхам прайшоў ад смяротна хворага паслушніка Алега да інака Мікалая і манаха Іаана. На памежжы матэрыяльнага і духоўнага – паэт Зьніч. Цяпер жа – падрабязней пра ўсё.

Вучыўся ў Беларускім політэхнічным інстытуце, але зразумеў, што гэта не яго, таму кінуў пасля 4-га курса. Пазней вучыўся ў Мінскім музычным вучылішчы, скончыў Мінскую кансерваторыю па спецыяльнасці «фартэпіяна». Потым захапіўся філасофіяй, скончыў аспірантуру Інстытута філасофіі і права АН БССР (1971 – 1974). Але дысертацыя аб народных і інтэрнацыянальных элементах у літаратуры не была абароненая, бо яе прызналі «нацыяналістычнай». Працаваў на тэлебачанні (1983 – 1984), у Акадэміі навук БССР (1984 – 1986).

З маладых гадоў А. Бембеля прыцягвалі ідэі ўсеагульнай любові і свабоды. Паступова прыйшоў да веры. На яго светапогляд шмат у чым паўплывала сястра маці, цётка Стася, якую ў 1930-я гг. за рэлігійныя перакананні саслалі ў Архангельскую вобласць.



На месцы былой сядзібы баярына Солтана бліз Жыровічаў (2008 г.)

Адна з найбольш вядомых яго працаў – кніга «Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс», над якой працаваў у 1979 – 1981 гг., выйшла ў Лондане ў 1985 г. Прысвечаная моўнай сітуацыі ў БССР і рэальнаму стану беларускай мовы ў СССР. У часе напісання кнігі праводзіў шырокае анкетаванне па гэтай тэме, што тады было забароненай тэмай для савецкіх сацыёлагаў; яго вынікі былі выкарыстаныя ў кнізе.

У тэарэтычнай частцы аўтар сцвярджаў, ґрунтуючыся на прынцыпах экалогіі культуры, што ва ўмовах пасілення маральнай і эстэтычнай паўперызацыі чалавека яго родная мова, як найбольш універсальнае і цэльнае выяўленне этнасу і эстэтыкі народа, можа і павінна стацца магутным сродкам адраджэння і захавання духоўнасці чалавека. Уласна, высновы гэтыя актуальныя не толькі ў канцы мінулага стагоддзя, але і сёння.

Пасля выхаду кнігі А. Бембель быў рэпрэсаваны: выключаны з КПСС (1986) і звольнены з Інстытута філасофіі і права. Больш за тое – аддзел эстэтыкі і псіхалогіі, дзе ён працаваў, быў распушчаны. Ва ўстановах навукі і культуры збіраліся сходы дзеля «асуджэння яго дзейнасці».

У канцы 1980-х гг. Алег Андрэевіч стаў актыўным удзельнікам беларускага нацыянальнага руху. І ў той час пад псеўданімам Зьніч публікаваў свае вершы ў самвыдаце, незалежнай прэсе, а таксама ў ЗША і Польшчы. У 1989 г. супрацоўнічаў з часопісам «Праваслаўная думка». Як літаратурны дадатак да яго, зборнік вершаў А. Бембеля «Малітвы за Беларусь» быў упершыню выдадзены на радзіме. У 1989 г. стаў членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, а з 1991 г. працаваў у Нацыянальным навукова-даследчым цэнтры імя Ф. Скарыны.

За жыццё меў некалькі афіцыйных і грамадзянскіх шлюбаў. Мае дзвюх дачок – Таццяну (яна вядомая мастацтвазнаўца) і Ірыну.

А потым – чарговы рэзкі паварот у лёсе, які напачатку быў са здзіўленнем і неразуменнем успрыняты нават блізкімі А. Бембеля. Спісвалі на імпульсіўнасць і ўтрапёнасць натуры. З 1996 г. ён стаў паслушнікам у праваслаўным манастыры ў Жыровічах. Спачатку стаў манахам Мікалаем, прыняўшы пострыг – айцом Іаанам. За манастырскім мурам працягвае пісаць вершы, рэдагуе багаслоўска-літаратурны беларускамоўны лісток «Жыровіцкая абіцель», падтрымлівае кантакты з журналістамі, літаратарамі, навукоўцамі. Бард Андрэй Мельнікаў на вершы Зьніча (Алега Бембеля) напісаў цыкл песень.

Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА

Пад час мітынгу ў памяць рэпрэсаваных (пач. 1990-х гг.)

У айчынных традыцыях яго творчасць яднае ў сабе рэлігійны і патрыятычны матывы. Вось як гэта ён засведчыў у вершы «Хрыстос і Айчына»:

Раскрыжаванне кат завершыў...
аблашчыў кужаль кроў Жыцця...
так: Плашчаніца – гэта Першы
мой Бел-Чырвона-Белы Сцяг!

Падрыхтаваў
Уладзімір ПУЧЫНСКІ

ГА «Беларускі фонд культуры» і «Краязнаўчая газета» віншуюць Алега Андрэевіча, айца Іаана – з паважным юбілеем. Шчыра зычым здароўя, плёну на ніве духоўна-нацыянальнага ўзгадавання братоў-беларусаў, моцы «нанова біцца з нячыстым у паняверцы».

Зьніч

* * *

...а дзе абшар Крывіцкай мовы?.. –
спытае нас «языкоед»...
праз тысячы і зім... і лет –
яна люляе Край Хрыстовы...
...і Літургічнай... і дзяржаўнай...
і мовай чыстае красы,
што лашчыць ружы й верасы... –
яна была – з часін прад-даўніх...
...у ёй – і акіян Славянскі...
і ручаіны хутароў...
...і дух Хрыстовых святароў –
ад Жырава... – і да Аляскі...
...і – далей... па ўсёй зямлі –
да Новага Яго Прышэсця –
яна ня змоўкне... ні ў Бярэсці...
ні ў Беластоку... ні ў Крамлі...
вянок яе – Сусвет абвіў...
стаў сапраўды – Жыцця Крыніцай...
бо гэта – Мова Плашчаніцы...
бо гэта – Мова на Крыві...

«Англічанка на Крэсах»

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 32 – 34)

Імяніны і імянінны стол

Польскія імяніны – гэта вельмі важная падзея, у гэты дзень наладжвалася сапраўднае свята. Свякроў Ірэны адзначала імяніны ў дзень Святога Казіміра разам з імянінамі свайго мужа і сына, а пазней яшчэ і ўнука Максіміліяна Люцыяна, чацвёртага ў мужчынскай галіне. Муж Ірэны казаў, што ў маладосці яго маці была скупаватая, але з цягам часу навучылася прымаць гасцей. Стол угінаўся пад цяжарам талерак з нарэзанай шынкай, языкамі, каўбасамі, салёнымі селядцамі ў памідоравым соусе, сардзінамі і шпротамі, яйкамі ў маянэзе, грыбамі, шніцэлямі, запечаным ў смятанным соусе. На асобным століку стаялі невялікія кілішкі з віном, гарэлкай і вермутам. Па польскім звычаі, госці размяшчаліся дзе хто хацеў, абслугоўвалі іх гаспадары. Станіслаў, у белым пінжаку і пальчатках, паружавелы і прывабны, кроіў мяса і накладаў на талеркі, а таксама ўпрыгожваў рознымі прыправамі. Ён ведаў усіх гасцей, вёў з імі размовы, прапаноўваў тую ці іншую страву. У канцы ўсе сядалі за стол на вячэру. За сталом панаваў вясёлы настрой, гумар, госці размаўлялі. Размовы вяліся свабодна на польскай, рускай, французскай і англійскай мовах, нават час ад часу хтосьці расказваў нямецкі анекдот.

«Бандыты» і мястэчка

Так называлі невялікую вёску, дзе ў часы безуладдзя, адразу пасля Першай сусветнай вайны, жылі бандыты, што аселі ў сваёй радні. Калі наладзіўся парадак, бандыты сталі фермерамі, вырошчвалі жывёлу. Недалёка ад маёнтка знаходзілася мястэчка. Да мястэчка вяла алея, абсаджаная дрэвамі. Выязджалі ў мястэчка па справах звычайна на вазку праз цэнтральную браму. Фурманам быў Філарчук, якога Ірэна ўспамінае ў кнізе некалькі разоў. Дарога ішла каля могілак, на кронах высокіх дрэваў было шмат вароніных гнёздаў, вароны ўзляталі над могілкамі і страшэнна моцна каркалі. Самі могілкі былі панурыя і занядбаныя. Мястэчка ранкам было ціхім, вуліцы пустымі, і толькі стукат капытоў будзіў соннае царства. На рынку стаяла некалькі яўрэяў, іх добра было відаць здалёк дзякуючы спецыфічнаму адзенню. Яны чакалі аўтобуса. Сцены касцёла здаваліся вельмі светлымі ў промнях сонца, а ўсёвідушчае вока, намаляванае над уваходам, паглядала на ціхае мястэчка.

Смерць дачкі

Была зіма. Нападала шмат снегу, стаялі невялікія марозы. Дзеці пасля заняткаў з гувернанткай пані Ганнай часта выходзілі на вуліцу пазабаўляцца. Аднаго разу пасля снежных забаваў Тэрэсе стала дрэнна. Выклікалі ўрача. У Тэрэсы паднялася тэмпература, моцна балела галава. Урач агледзеў дзяўчынку, выпісаў лекі. Пад раніцу ёй стала зусім дрэнна. Ірэна пабудзіла мужа. Яна патрабавала, каб ехаў у мястэчка па іншага доктара, па дзядзьку Івана Малкевіча. Яна давярала толькі яму. На вуліцы была мяцеліца, але коней усё роўна запрэглі і паехалі. Доктар прыехаў хутка. Паглядзеў дзяўчынку і сказаў, што тэрмінова трэба везці ў Вільню да спецыяліста, у дзяўчынкі хутчэй за ўсё менінгіт. Тэрэса ведала доктара, таму была вясёлай, размаўляла з ім. Доктар прасядзеў з дзяўчынкай усю ноч, а раніцай вырашылі ехаць да Наваельні, а там цягнікам да Вільні.

У Вільні паехалі спачатку да бабкі, а потым у шпіталь на Антаколі, у прадмесці горада. У суседняй палаце ляжаў хворы хлопчык, які моцна крычаў. Ён быў маленькі, без мамы. Тэрэса вельмі яго шкадавала і хацела наведаць раніцай, але не паспела. Хлопчык памёр. Пад вечар Тэрэсе таксама стала горш. Яна ўжо слаба гаварыла, толькі ціха паклікала маму і сказала, што хоча яе пацалаваць. Больш яна нічога ўжо не сказала. Дачка памірала некалькі дзён. Увесь час побач з Ірэнай быў муж. Яны начавалі ў шпіталі, дзяжурылі па чарзе. Але выратаваць дзяўчынку ўрачам не ўдалося.

Алена АБРАМЧЫК,
навуковы супрацоўнік
Дзятлаўскага краязнаўчага музея

Колісь у Рагачове...

Так кажуць на Рагачоўшчыне

Хоць вачам сорамна, затое душа радуецца.
Без мяне мяне ажанілі.
І ў марац адмарозіш палец.
Добрахвочы глядзіць скупому ў вочы.
Сядзіць, раскапусціўся.
Як вадой размылася.
На святога Абрама.
Кандзібоберам пайшоў.
Запэцкаўся, як Магося.
Да пятага мая кажух не здымай і з печы не злазь.

Запісаў Міхась СЛІВА

... і сёння ў вёсцы Асінаўка на Рагачоўшчыне

«Белавежаю крочаць зубры...»

Да 610-годдзя абвяшчэння Белавежскай пушчы запаведнай

Уздоўж

1. Паляўнічы .... Тое, дзеля чаго наведвалі ў розныя часы Белавежскую пушчу каралі, князі, цары і інш. **5**. «Зубр, як мы лічым спрадвеку, хоць ..., але ж ратнік». З паэмы М. Гусоўскага «Песня пра зубра». **7**. Беларуская ўрадавая рэзідэнцыя на тэрыторыі пушчы, дзе ў 1991 годзе вырашыўся лёс былога Савецкага Саюза. **8**. Першабытны дзікі бык, якіх шмат вадзілася ў Белавежскай пушчы; апошні ... быў забіты ў XVII стагоддзі. **9**. Імя ў хрышчэнні вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага, караля Польшчы Ягайлы, які любіў паляваць. Менавіта на яго загад 610 гадоў таму, у 1409 годзе, у Белавежскай пушчы быў усталяваны запаведны рэжым. **12**. «Панясу твой ... запаветны дамоў // Белавежская пушча, Белавежская пушча». З песні «Белавежская пушча» (сл. М. Дабранрава, муз. А. Пахмутавай). **15**. Птушка з доўгім носам. **16**. Горад на Міншчыне, раённы цэнтр. **17**. Вершаваная страфа з чатырох радкоў. **18**. У птушак рагавое ўтварэнне з дзвюх падоўжаных сківіц. **20**. «Як алені, з кален п'ю святую ваду, // Беларуская ... – Белавежская пушча». З верша Л. Зубарава «Белавежская пушча». **22**. Лясныя ... для кожнай пары (прык.). **24**. ... і вада – брат і сястра (прык.). **26**. Вялікая птушка атрада курыных, якая ліняе ў чэрвені. **27**. «Белавежаю крочаць зубры, // Пушчы слаўнае валадары. // І гарбы ў іх крутыя, і ..., // Саступаюць усе ім з дарогі». З верша Л. Геніюш «Зубры». **28**. Буйны беларускі горад, герб якога ўпрыгожвае выява высакароднага аленя, сталага «жыхара» Белавежскай пушчы; на яго любіў паляваць кіеўскі князь Уладзімір Манамах.

Упоперак

1. Дзікі конь, які вадзіўся ва ўсёй Еўропе і быў знішчаны ў XIX стагоддзі; свой апошні прытулак ён атрымаў у Белавежскай пушчы. **2**. Англійская мера даўжыні. **3**. Хітры, як ..., а баязлівы, як заяц (прык.). **4**. Лясны жаваранак. **6**. Ручаёк. **10**. Аграгарадок, адміністрацыйна-гаспадарчы і навуковы цэнтр Белавежскай пушчы. **11**. Сапраўдны паляўнічы ва ўгоддзі – што добры ... у двары (прык.). **13**. Род папугаяў. **14**. Май – радасць, а чэрвень – ... (прык.). **17**. Тое, што і бур. **19**. У ваўка заўсёды ... вінаватая (прык.). **21**. На паляванні сем вёрст не ... (прык.). **23**. Паспрачаліся за ..., а ў мяху – смех (прык.). **25**. Лічба.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ



Снежань

23 – Бераў Міхаіл Сямёнавіч (Майсей Залманавіч; 1909 – 2003), кінааператар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

24 – Алесь Дудар (сапр. **Дайлідовіч Аляксандр Аляксандравіч;** 1904, Петрыкаўскі р-н – 1937), паэт, крытык, перакладчык – 115 гадоў з дня нараджэння.

24 – Бялова Антаніна Аляксееўна (1924 – 1993), мастак кіно, жывапісец, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння.

24 – Зарыян Даленга-Хадакоўскі (сапр. **Чарноцкі Адам;** 1784, Лагойскі р-н – 1825), славяназнаўца, адзін з пачынальнікаў беларускай, польскай, рускай, украінскай археалогіі, старажытнай гісторыі, фальклярыстыкі, этнаграфіі, дыялекталогіі – 235 гадоў з дня нараджэння.

25 – Караў Дзмітрый Уладзіміравіч (1949), вучоны-гісторык, гістарыёграф, археограф, даследчык гістарыяграфіі і крыніцазнаўства гісторыі Беларусі, гісторыі культуры Беларусі XVI – XX стст. – 70 гадоў з дня нараджэння.

25 – Лагоўская Алена Іванаўна (1904 – 1981), актрыса, заслужаная артыстка Беларусі – 115 гадоў з дня нараджэння.

25 – Талаш Васіль Ісакавіч (1844, Петрыкаўскі р-н – 1946), удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, беларускі народны герой – 175 гадоў з дня нараджэння.

25 – Шэлег Анатоль Рыгоравіч (1909, Мінск – 1988), акцёр, народны артыст Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

26 – Напельбаум Майсей Саламонавіч (1869, Мінск – 1958), фотамайстар – 150 гадоў з дня нараджэння.

27 – Забалоцкая Людміла Васільеўна (1949, Крычаў), паэтэса – 70 гадоў з дня нараджэння.

27 – Лясун Святлана Лаўрэнцьеўна (1949, Быхаўскі р-н), баяністка, педагог, народная артыстка Беларусі, узнагароджаная ордэнам «Знак Пашаны» – 70 гадоў з дня нараджэння.

27 – Макарава Галіна Кліменцьеўна (1919, Старобін – 1993), актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Беларусі і СССР, узнагароджаная ордэнам Леніна – 100 гадоў з дня нараджэння.

29 – Гурыч Соф'я Якаўлеўна (1919, Мінск – 1999), актрыса, рэжысёр тэатра і радыё, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984) – 100 гадоў з дня нараджэння.

29 – Тарасаў Віктар Паўлавіч (1934, Смалявічы – 2006), акцёр, народны артыст Беларусі, народны артыст СССР – 85 гадоў з дня нараджэння.

30 – Аксельрод Зэлік Майсеевіч (1904, Маладзечна – 1941), паэт, перакладчык – 115 гадоў з дня нараджэння.

31 – Бяльзацкі Юрый Давыдавіч (1909 – 1963), кампазітар, дырыжор, піяніст – 110 гадоў з дня нараджэння.

31 – Паўлюк Шукайла (Павел Захаравіч; 1904, Бераставіцкі р-н – 1939), паэт, крытык – 115 гадоў з дня нараджэння.

Народ сказаў...

Маці. Чаму ты, сынок, нічога ў пару не робіш? Помні, што адклад не ідзе на лад.

Сын. Ах, калі так, мамачка, дык тады дай мне сягоння тыя цукеркі, што ты схавала на заўтра.

Сустрэліся два хлопцы.

– Чаму ты кульгаеш? – пытаецца адзін.

– Бацька набіў, – кажа другі.

– За што?

– За 5 капеек.

– За якія 5 капеек?

– Што асталіся ад палучкі. Каб прынёс больш, дык, мусіць, зусім забіў бы.

– Што з табою, Мацейка, ты гэтак абвязаны?

– Мая баба кінула гарлачом у мяне...

– Няўжо ты не мог адхіліць галаву, як гарлач ляцеў?

– Чаму не мог? Але тады б ён у вакно паляцеў.

– Мама, я пазнаёмілася з маладым інжынерам, які мне сказаў, што я вельмі разумная і разважлівая.

– Дык ты не сустракайся з ім болей.

– Чаму?

– Няхай і далей так думае.

Паводле зборніка «Беларускія народныя жарты» (сабраў Змітро Бяспалы; Мінск, 1970)



Жарты падгабляваць, падшліфаваць і... рот на замок

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

ПЛЯЦЕ́ННЕ (*заканчэнне артыкула*). Больш складаны від пляцення заснаваны на выгінанні суцэльных нітак у петлі, што пераплятаюцца паміж сабой удоўж і ўпоперак, – вязанне. Шырокую папулярнасць набыло вузельчыкавае пляценне – макрамэ. Найбольш вядомыя майстры П. Агафоненка, П. Анікейчык, К. Арцёменка, А. Белановіч, С. Галанчанка, В. Гаўрылюк, Л. Главацкая, С. Каляда, М. Кулак, Н. Ліцюк, А. Лук'янец, Т. Паўлоўская, Г. Сапун, Л. Скрыпнічэнка, В. Сташкевіч, Т. Федаркова, С. Шчарбіцкі ды інш.

Простым вузлом мацавалі махры па краях абрусаў, сурвэтак, пакрывалаў, ручнікоў. З дапамогай чаўнака (ігліцы) і дошчачкі вязалі рыбалоўныя сеткі (Паазер'е). Такія ж сеткі, нацягнутыя на раму, аздабляліся вышыўкай насцілам ці крыжам з каляровых шарсцяных нітак і ўжываліся як абрусы, сурвэткі, пакрывалы.

У наш час у традыцыйным выглядзе бытуе пляценне карункаў, сурвэтак і абрусаў, лазовых кошыкаў для садавіны і гародніны ды інш. Шырока развіваецца яно як від дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва і таму значнае месца займае ў мастацкай прамысловасці. Фруктоўніцы, цукерачніцы, карзінкі, хлебніцы, падносы, шкатулкі, сумкі, насценныя пано, дробную пластыку з лазы, саломы, чароту, стружкі ў спалучэнні з ніткамі, пластыкам, шнурам выпускаюць розныя фабрыкі мастацкіх вырабаў (сярод іх – былая Маладзечанская фабрыка мастацкіх вырабаў, што належыла БФК). Вытворчасць гаспадарчых рэчаў з лазы, чароту было наладжанае ў калгасах Глускага, Светлагорскага, Любанскага раёнаў.

Кошык лазовы. Марыя Шымко

Кош лазовы з падкладкай. Людміла Войнава


Сурвэтка вязаная. Тамара Матыль


Кампазіцыя салатная «Калаўрот». Людміла Акавітая

Пляценне кошыка

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6.
Тэл. 283-28-26.
Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 19.12.2019
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 29.03.2004.
Заказ 675.
Тыраж 424 асобнікі.